**Аксана Спрынчан**

# ЖываЯ

KAMUNIKAT.org

**Мінск**
**Мастацкая літаратура**
**2008**

**Спрынчан, А. В.**
С74 ЖываЯ: вершы /Аксана Спрынчан; дызайнер Р. М. Найдзен. – Мінск: Маст. літ., 2008. – 94 с.
**ISBN978-985-02-1048-7.**

Вершы ў новай кнізе Аксаны Спрынчан вызначаюцца істотнасцю перажытай і ў той жа час лёгкай, у пэўным сэнсе летуценнай думкі, гарманічным спалучэннем традыцыйнага і наватарскага. Аўтарка пашырае арэал прысутнасці ў сучасным літаратурным жыцці візуальнай паэзіі і паэзіі імгненняў-вечнасці.

KAMUNIKAT.org

**жываЯ?**

задаю сабе пытанне і часам толькі таму,
што задаю,
даведваюся,
што жываЯ.

KAMUNIKAT.org

? ? ?

Пішу на каменьчыках літары,
шпурляю ў ваду.
Кругі, як жыццё, разыходзяцца –
- - - - - **К** - - - - -
- - - - - **А** - - - - - -
- - - - - **Х** - - - - -
- - - - - **А** - - - - -
- - - - - **Ю** - - - - -
- - - - - **?** - - - - -
- - - - - **Л** - - - - -
- - - - - **Ю** - - - - -
- - - - - **Б** - - - - -
- - - - - **Л** - - - - - -
- - - - - **Ю** - - - - -
- - - - - **?** - - - - -
І ў неба ўглядаюся вусцішна,
што тоне ў вадзе.
А з моўчы глыбокай дыханне
ці аблачыны,
ці рыбіны:
(ж)
(ы)
(в)
(у)
(!)
і
(ж)
(ы)
(в)
(і)
(!)
і
(ж)
(ы)
(в)
(е)
(!)

KAMUNIKAT.org

? ? ?
Туман увосень з водарам вясны…
Чаму б далей не жыць на свеце белым?..
Ды паміраюць у сяброў бацькі,
пад гэтым небам больш сябры не дзеці…
Баюся ім у вочы зазірнуць,
убачыць тое, што мяне чакае…
Сябры – не дзеці,
я ж – яшчэ дзіця,
хоць і ў тумане тлумнага пытання:
«Чаму б не жыць?..»
У водары вясны
гусцей туга апошняга туману…
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Я запрашу гасцей…

? ? ?
Збіраю ажыны…
Нябёсы далоняў
апякаюць маланкі…
І так ажынна-адвечна
спытаўся пляменнік:
-- А што такое шчасце?
Я не ведаю
і кідаю ў неба,
як сінюю зорку, ажыну:
-- Глядзі, мой жэўжык,
зараз мы пачастуем
сінюю птушку…

? ? ?
На Белым возеры
ля каранёў сасны,
што цягнуцца
ў бясконцыя стагоддзі,
гляджу на кветку-матылёк –
лабелія…
Палеская краса,
а святасці ў ёй,
што боязна мне нават дакрануцца.
І раптам
белы матылёк злятае,
і з белым вершам
я за ім
(за ёй?)
імкнуся.

? ? ?
Бензапіла рыкае,
нібыта карова.
Пілавіннне пырскае
кроплямі малака.
Падае дрэва –
будучыя дровы.
Раве за лесам карова
так вусцішна,
рыхтык забіваць яе
рыхтуецца не хтосьці чужы,
а я…
А я
    раву
        за лёсам…

? ? ?
Сонца ці месяц? --
пытаешся раптам.
А я абіраю
поўню,
якая ведае,
што такое быць месяцам,
якая верыць,
што яна ёсць сонцам.

Сонца ці сон? --
задаеш пытанне.
А я называю –
сон-траву,
якая ведае
калыханку сонца,
якая верыць
у сны на вятры...

? ? ?
Вочы заплюшчыла:
не ведаю, куды глядзець –
на мапу радзімак тваіх
ці на зорную мапу неба
над намі?

KAMUNIKAT.org

? ? ?
Калі б не дрэвы
і неба,
не дарогі
і восень,
хто б слухаў,
як я
спяваю
без голасу,
слыху,
з душою?..

? ? ?
Шукаю сутву быцця
і сутву нябыту шукаю…
Каюся,
і грашу…
Ды не каюся,
а хаваюся
ў пошуках,
пошуме,
полымі
іншай душы…
Як між быццём і нябытам
сутву сваю знайсці?
Як не пакінуць раны
на небе і на зямлі?..
Бо як да сутвы набліжуся –
у вырай нехта ляціць…

KAMUNIKAT.org

? ? ?
Мне трыццаць тры. Я ўкрыжавана светам,
які і сам укрыжаваны мною...
Так ціха ў восень адыходзіць лета,
як у нябыт мае гады сыходзяць...
Быць ці ня быць?
Я абіраю Быць!
І дзівіцца з мяне чужая знічка.
Той свет, якім укрыжавана, нібы спіць,
і котка скідвае на дол вялікі цвік,
нібыта цвеліць
будучага Юду.

? ? ?
Ні дня без радка –
свайго ці чужога.
Многа ці мала
прашу ў Бога?
Многа ці мала
прашу?
Многа ці мала?
Многа...
...У Бога?!.

? ? ?

*Вадзіму*

З рукі ўзлятаюць пальцы,
нібы птушкі.
Твае – з маёй,
ну а мае – з тваёй.

Тваe – у вырай,
за мяжу імкнуцца,
маім –
і ў скутай зімнасці Айчыны
заўсёды ўтульна...
І што ў табе
ад імені твайго –
ляцець ад зім,
ці рыфмаваць з Радзімай?
І што ў табе
ад імені майго? --
Яно –
ад першай літары
з Айчынай.

? ? ?
Ты дзесьці там,
у Францыі,
а тут беларускія апалонікі
губляюць свае хвасты...
Твой сум
па Радзіме?..

KAMUNIKAT.org

**жываЯ:**

стаўлю двукроп’е і пералічваю
назоўнікі жаночага роду адзіночнага ліку
БЕЛАРУСЬ,
ЗЯМЛЯ,
МОВА,
ПАЭЗІЯ,
ПРЫРОДА і інш.

KAMUNIKAT.org

* * *

Ты пахнеш Лунінцам,
трускалкавым дываном...
Вось-вось зачырванелася першая ягада,
і трэба яе неяк дастаць,
пакуль не бачыць бабуля,
бо нават маленькую ножку
няма куды паставіць,
каб не расціснуць зялёныя...
Але што мне астатнія, калі ёсць ты,
бо ты пахнеш Лунінцам,
трускалкавым дываном...
А-ёй! Увесь дыван чырвоны,
перапоўнены стомай ад сонца,
і я стамлёная
ад напаўнення кошыкаў спеласцю,
і ўжо няма той жарсці,
калі дакранаешся вуснамі
да трускалак, цябе,
які пахне Лунінцам,
трускалкавым дываном...
Божухна! І гэта ўсё трэба праполваць,
знікаць у траве будзённасці
і толькі згадваць ягадны рай
і паціху забываць –
ты пахнеш Лунінцам,
трускалкавым дываном...
Сны, сны, сны, час вясны,
кветкі, якія не дорыш мне,
бо ведаеш – не даравала б
сарваны вэлюм трускалкі...
Але раптам ты просіш заплюшчыць вочы,
і да вуснаў маіх
дакранаецца нечаканая слодыч,
і я зноўку ўпэўненая –
той, каго я кахаю,
пахне тым, што я люблю...
Ты пахнеш Лунінцам,
трускалкавым дываном...

: : :
Я нарадзілася
ў маленькім паўднёвым мястэчку,
дзе растуць бурштынавыя абрыкосы
і вінаград колеру закаханых сініх вачэй,
дзе чырвоныя купалы вяргіняў
упрыгожваюць чырвоную царкву,
дзе грушы падаюць у жніўні, як знічкі,
а знічкі любяць не мора,
а Прыпяць, Белае возера
і глыбокія студні...
Я нарадзілася на поўдні
Беларусі...
І не існуе ў свеце такой Вясны,
якая б прымусіла вырачыся
майго лунінецкага выраю.

: : :
Вып’ю кубачак кавы
і пайду на канаву
ўзгадваць маленства...
Сястра Алёнушка
пад старым лунінецкім вязам кажа:
-- Паеду на мора.
І тут жа перадумвае:
-- Не, лепей я пайду
з дзедам на канаву.
Ні дзеда,
ні дзяцінства,
у якім я не любіла каву,
а толькі сырадой...
Але і яго няма,
як няма і старога вяза...
А ёсць любоў
і наш з сястрою жыццёвы пароль:
-- Паеду на мора.
-- Не, лепей я пайду на канаву.

: : :
Лілею я ў руках трымаю,
успамінаючы радок:
«Лілею млявы плёс люляе...»,
а белакрылы матылёк
не ўецца –
зранку рэзкі вецер
алітэрацыю на «л»
зрывае
і прыносіць радасць
асацыяцыі з Радзімай –
алітэрацыю на «р»...

: : :
На Нямізе –
у весняй раскошы каштаны...
Над кожным суквеццем,
якое імкнецца ў нябёсы,
як над катэдрай званы,
звіняць пчолы...

: : :
Успамінаю цябе,
а ўспамінаецца верш,
вера твая ў мяне,
вярба над вадой замерзлаю...
Успамінаю верш,
а ўспамінаешся ты,
вера мая ў цябе,
галінка, зламаная ў Вербніцу.

: : :
Ля помніка Міцкевічу
ты глядзіш на аблокі
і слухаеш ягоныя вершы,
прысвечаныя мне.
Невядомыя
ні польскім,
ні нашым даследчыкам,
бо толькі закаханыя
іх чуюць,
пакуль не зразумеюць,
што закаханыя.

: : :
Перад захадам сонца
ты чытаеш Хайдэгера.
А я п’ю каву і гляджу
на раскрытыя
«Час і быццё».
У перакуленых літарах
таямнічая значнасць
звычайнае рэчы,
і я чую кліч цішыні.
Але сонца хаваецца,
і ў размовах сплывае
і час, і быццё...

: : :
Чорная кава
і лустачка чорнага хлеба...
Горыч рабіны
усыпана скрозь белым кветам,
горыч расстання

KAMUNIKAT.org

сплывае ў аблоках,
і лёгка
кінуць апошнюю лустачку
птушкам за вокны,
і паглядзець,
што на чорным пяску
засталася с***цяж***ын***ка***,
і прачытаць на ёй раптам
амаль без запінкі:
***цяжка***...

## ПЯЦЬ, СЕМ І ЗНОЎ ПЯЦЬ...

*Хоку-паэма Лысай Гары*

1.1
Муха на шыбе
звініць восеньскім сумам.
Чуецца хоку.

1.2
Жоўтае лісце
ў сажалцы замест жабак.
Вецер крумкае.

1.3
Цень ад матылька
на цэлыя тры радкі.
Хоку чытаю.

1.4
Зязюля села
ў рукі старой. Год назад
муж яе памёр...

KAMUNIKAT.org

1.5
Пара ад кавы
падымаецца ў неба;
хмарка цямнее.

2.1
Сноп жыта стаіць
у хаце. Прыгадала
«Жняю» Купалы.

2.2
Гушчу ад кавы
з цукрам вожык спрабуе.
Смачнага лёсу!

2.3
На хрызантэмах
жоўтае лісце вішні
вось-вось узляціць.

2.4
Яшчарка ў цэбры
плавае. Прыгледзела-
ся – нежывая.

2.5
Птушка прысела
на дрэва. Апошні ліст
расправіў крылы.

KAMUNIKAT.org

2.6
Працягвае мне
далоні свае восень,
халодны поціск.

2.7
Жоўты ліст кладу
ў пажаўцелую кнігу.
Безназоўнае...

3.1
У ракавінцы
попел ад цыгарэтаў;
высахла мора.

3.2
Вясёлка ў небе
па-восеньску прыгожым.
Мёрзлыя астры.

3.3
Жоўтая восень.
Елкі пазелянелі.
З зайздрасцю вечнай.

3.4
У кастрычніку
дождж цыганскі, як летам;
змывае шэрань.

3.5
Пяць, сем і зноў пяць...
Над Лысай Гарой свеціць
сузор'е Хоку.

KAMUNIKAT.org

**жываЯ…**

Шматкроп'е хавае ў сабе невядомы працяг
і вядомае робіць шматзначным.

KAMUNIKAT.org

… … …
Так даўно
не прыходзілі словы --
дзве поўні паспелі
неба працяць тугою
і знікнуць.
Неаднойчы мне снілася –
зорка ляціць
і разбіваецца
аб чужое жаданне кахання і славы.
І я шукаю зорку сваю,
каб пахаваць
згодна звычаям зорным
паміж словаў і сноў...
А словаў няма...

Так даўно
не прыходзілі словы,
што і сны
перасталі прыходзіць...

… … …
Шукаю тое,
што яшчэ згублю.
Сама сабе дапамагаю...
...губляць...

KAMUNIKAT.org

… … …
Увесну дзялюся лістотай,
улетку – сенам,
увосень – насеннем,
узімку дзялюся наканаваннем
несумоўнасці…

… … …
Выпраўляю цябе ў дарогу
і не плачу,
бо ёсць каму плакаць
ад расстання з табой…
Выпраўляю цябе ў дарогу
і не плачу,
бо ёсць каму маўчаць
ад расстання з табой…

… … …
Я хачу стаць гэтым дажджом,
бо мне не стае маіх слёз…

Ты хочаш стаць гэтым дажджом,
каб не бачыць маіх слёз…

… … …
Кроплі зрываюцца з даху,
ні-
бы-
та
людзі…
Людзі зрываюцца з даху,
ні-
бы-
та

KAMUNIKAT.org

птушкі…

Птушкі зрываюцца з даху,
ні-
бы-
та
неба…
Неба зрываецца з даху,
ні-
бы-
та
кветкі…
Кветкі зрываюцца
ў бездань адчаю
з апошнім пялёсткам –
«Н
е
к
а
х
а
е»!..

KAMUNIKAT.org

## ВЕРАЦЯНО ХАЛОДНАГА ЛЕТА
***Паэма***
***з недасланых вершалістоў***

I
Стрымаць сябе, каб нават цень твой не крануць
ні дотыкам, ні словамі прызнання,
ні ценямі мінулага майго…
Глядзець на вогнішча,
але не пераскокваць –
бо сёння ж не Купалле…
І толькі голас чуць, што б’ецца ў камяні…

Гамер мне так чытаў
калісьці «Іліяду».

*P.S. Вершалістом*
*маё маўчанне б'ецца...*

I I
З палыновай халоднай гарбатай
ты кубак падаў мне,
а я апяклася
горкім ценем самоты,
гаркавай магчымасцю шчасця,
гаркатою халоднага лета...

*P.S. Бліжэй за ўсё*
*мне водар палыну...*

I I I
Рысь
на паштоўцы
ловіць твой цень
маімі вачыма, ад жарсці рыжымі,
і кіпцюрамі выдрапвае
словы прызнання на ім,
і ратуе –
пэндзлікамі вушэй замалёўвае...

IV
Запляці азярод
з маіх валасоў, --
Не з ляшчыны й сноў
запляці азярод.

Між чужых галасоў
прамаўчу свой зварот:
запляці азярод
з маіх валасоў.

*P.S. У азярод заплецена самота*
*і ў гэты вершаліст і трыялет...*

V
Вусны твае --
палыновыя, як Беларусь...
Голас
гучыць прыгажосцю Элады...
Ты на руках
узнімаеш мой цень над зямлёй.
Падае гузік, нібыта жарынка.
Мы разам...
згараем...

*P.S. Поўня чытае мой вершаліст,*
*неадасланыя радкі*
*голасам, поўным святла,*
*напаўняе...*

VI
У хату лясную, дзе рысь зазірае ў акно
і бачыць,
як сінімі рунамі неба малюеш,
прыходзіць жанчына, як рысь маладая,
і белыя плямы на сіняй паперы
абрысы яе набываюць –
абрысы лясное тугі.

VII
Выйшла на ганак –
праз цемру пачуліся крокі твае.
Не, не ты.
Гэта кроплі дажджу з даху...
Ды знаходжу сляды –
жоўтае лісце вішняў.
Узгадваю –
ліпень.
У халодным ліпені
нараджаецца
лістапад...

*P.S. Вершаліст ападае*
*са стала на падлогу,*
*падбіраю,*
*кладу між старонак кнігі...*

VIII
Пакажу табе сузор'е Рысі...
Ты прыгледзься, як яна стаілася
між Мядзведзіцай Вялікаю і Вознікам.
Паглядзі,
як свеціцца ад жарсці кожнай зоркаю,
як, здаецца,
нам махае лапаю ў ноч халодную...
Рудае святло яе губляецца
ў нашым вогнішчы...

Сёстры на зямлі яе шкадуюць –
адзінокая...

*P.S. У нашым вогнішчы*
*губляемся і самі...*

IX
Дождж, празрысты як гарэлка,
налівае ў чарку лету,
і яно, халоднае,
п’е пітво сваё
і не бачыць нас – толькі цені
азяродам паміж і лілеяй,
камянямі  паміж і дубамі,
у радках, якіх не запісалі…

X
Я сама згубіла цішыню,
коціцца сляза па шыі,
рукі, вышытыя крыжыкамі зморшчынак,
цягнуцца да чаркі з небыццём…
А быццё заснуць мне не дае
піскам камарыным…
Поўня блізка… --
сцішуся, каб тайка* не скацілася
на крык…

XI
Мыю твае валасы
пад сонцам вадою празрыстай,
праз гушчыню
прабіраюся да каранёў.
І табе ад мяне не схавацца нікуды…
Сёння я
дождж начны, што прымроіў,
быццам мыю твае валасы,
бо ты не выходзіў з хаты –

* Тайка (дыял.) – сардэчная сяброўка.

сядзеў і запісваў,
як крапае дождж на ўскраіне,
і не чуў,
як б'юся ў акно.

*P.S. Баюся сама сябе...*

XII
Мой цень згубіўся б у тваім,
калі б не вецер,
што развявае валасы па белым свеце…
І знебываецца твой цень матляцца ў полымі,
і ты знікаеш без мяне –
стыхіі вогненнай…

XIII
Мне снілася, што ты знайшоў крыніцу,
і два вядры вады сцюдзёнай
несла я
не ў хату да сябе (яе ў мяне няма)
і не ў тваю (і ты жывеш без хаты)…
У белы свет…
у хату са святла,
дзе нам даруюць жарсці і расстанні,
і супадзенні з кроплямі дажджу
і з помнікамі людзям і вадзе –
сівымі камянямі…

*P.S. І гэты вершаліст*
*пакуль не мае хаты...*

XIV
На руках тваіх
зморшчынкі Элады,
драпінкі ад зорнае Рысі,
і апёкі ад вачэй маіх рудых...
Напісала і сама здзівілася, --
паэтычныя, нібыта край наш,
твае рукі –
беларуска-працоўна-беларускія.

XV
Цыганскі дождж варожыць мне пра тое,
што час прыйшоў развітвацца з табой.
Мне да канца –
бясконцая дарога
і лёс
у кожным камені і дрэве,
дажджы, што знойдзе і тваю крыніцу,
у азяродах, што кахаюць ружы,
і ў зорках, на якія не глядзеў ты, --
шукаць цябе і адшукаць
сябе...

*P.S. Цыганскі дождж на ганку выбівае:*
*бывае...*
*бывае,*
*памыляюся...*
*бывае...*

XVI

У вогнішча кідаеш ты палын,
і ён палае нашай горкай зоркай...
І палыновы водар назаўжды
яднае нас расстаннем і пяшчотай,
якая ўся –
у голасе тваім,
якая ўся –
ў маёй маўклівай ночы...

*P.S. У вогнішча кідаю я палын,*
*і валасы ўбіраюць водар жарсці...*
*Пяро жар-птушкі, што на міг убачылі,*
*яднае назаўжды сваім святлом...*

XVII

Вазьмі мяне ў далоні, быццам свечку,
і пранясі над светам, дзе вятры
зрываюць лісце і капелюшы,
хістаюць цені і дажджы...
Ну, а калі згару –
ты не рабі хаўтуры.
Я дажыла
ў тваім жыцці –
святкуй дажынкі.

*P.S. Зрывае вецер*
*вершаліст...*

KAMUNIKAT.org

XVIII
У леце,
не апошнім і не першым,
шукаю свой пачатак і канец.
Яно жыве -- халоднае, як смерць,
пакутнае, як нежаданне смерці.
У ім квітнеюць рудыя лілеі,
і знічкі падаюць –
шарсцінкі зорнай Рысі,
і першы раз сярпом зжынаю жыта,
і ўспамінаю –
я – «Жняя» Купалы.

Цяпер не страшна мне
знікаць у Леце.

*P.P.S.* ***На верацяно халоднага лета***
***я сваю душу наматала.***
***Ды не выткаць табе кашулю –***
***Атрымалася нітка з надрывамі.***
***Вельмі рвалася...***
***да цябе...***

KAMUNIKAT.org

**жываЯ,**
і не ведаю,
што пасля коскі яшчэ сказаць пра сябе.

KAMUNIKAT.org

, , ,
У кожнага верша,
напісанага мною –
свой твар.
Мае –
толькі зморшчынкі.

, , ,
Бусел
над плошчай
Незалежнасці.

Гэтае неба
яшчэ не пакінулі
аблокі...
Гэтую зямлю –
я.

, , ,
Пацалаваць вясной цябе,
калі сышлі ад нас снягі,
і адчуваць сябе чужой,
не, не табе зусім –
сабе
і раздзіраць сваю душу
радкамі словаў закаханых,
ды не ў цябе, --
у прыгажосць
сустрэч, аголеных чаканнем...
Пацалаваць вясной цябе,
калі сышлі ад нас снягі
і адчуваць сябе чужою,
вужакаю, якую ты
ад страху зблытаў
са змяёю...

, , ,
Не люблю цябе,
не кахаю,
аднак адчуваю цябе,
адчуваю
паміж небам,
квітненнем рабіны
і роднаю мовай...
У дыханні адчаю
дыханне тваё
адчуваю...

, , ,
А ў тваёй руцэ –
не мая рука,
а ў маёй рацэ –
камяні на дне.
Камяні, што кідалі
мы, шчаслівыя,
а кругі ад іх
разышліся, згінулі...
У тваёй рацэ
камень, што не тоне,
на маёй руцэ
крыжык,
каб успомніць...

, , ,
П'ю каву з украінскім мёдам,
сланечнікавым,
і цябе ўяўляю
трошкі сонным,
але болей – сонечным...
І раенне думак,

KAMUNIKAT.org

знітаваных з тваімі,
кружляе,
на галінку Сусветнага Дрэва
яны разам чапляюцца,
і вось-вось пабудуюць гняздо сабе
новае, лепшае...
Джаліць зноўку мяне
пчала беларускае рэўнасці.

, , ,

Калі-колечы я заспяваю,
як чорны дрозд,
якога ўратавала...
Калі-колечы...
Калі і сябе
сама
адпушчу на волю...

, , ,

Скрыжаванне са снежнем –
белым крыжам і чорным.
Скрыжаванне з самотай –
светлым крыжам і цёмным.
Скрыжаванне з Радзімай –
вечным крыжам і буднім.
Скрыжаванне з сабою –
белым крыжам і чорным,
светлым крыжам і цёмным,
вечным крыжам і буднім.
І зноўку ратуюць
Каляды...

**жываЯ –**

а асноўны працяжнік ставіцца
паміж датамі нараджэння і смерці.

KAMUNIKAT.org

## **Цяжарнасць і лёгкасць Быцця...**

*Ярашу, Альжбэце і Восені*

Месяц першы

Набрыньваем,
як пупышкі на вязе –
жыццё завязваецца
ўва мне
і ў чорнай вязі
літараў...

Месяц другі

Здзіўляюся жыццю.
Пакуль што
больш, чым смерці.
Здзіўляюся сабе.
Пакуль што
больш і больш.
Расце мой месяц ясны
і хутка стане поўняй.
І крык майго дзіцяці
запоўніць гэты свет
здзіўленнем
ад жыцця,
здзіўленнем
ад сябе...

Месяц трэці

Рушнікам выціраю слёзы.
За дзіцятка,
яшчэ не народжанае,
удыхаю
пяшчотнасць ружы.

Парушынка быцця –
у вока,
парушынка нябыту –
у думкі.
У прагнозе надвор’я
сёння
замаўчалі адсотак
вільготнасці…

Месяц чацвёрты

Я табе не чытаю
дзіцячыя кніжкі.
Ты са мной спасцігаеш
самоту і шчасце…
Як народзішся –
будуць і казкі, і вершы,
у якія паверыш,
каб потым
вярнуцца…
у самоту і шчасце,
спасцігаючы разам,
але ўжо
не са мною,
жыццё,
як каханне…

Месяц пяты

Ты граеш на леры,
шпалеры рве котка.
Пранізвае сум,
ды зусім не самотна:
дзіцятка ўва мне
б’е то ручкай,
то ножкай.
І лера сціхае,

і Восень прыходзіць,
вуркоча ціхенька:
“Хутчэй нараджайся!
Пакуль грацьме лера,
мы разам з табой
будзем драпаць шпалеры…”

Месяц шосты

Цяжарнасць
і лёгкасць
Быцця,
невыносная,
вынасіць
мару дзіцяці
пра маму,
што заплюшчыла вочы
і марыць
і не змораная,
а змараная
за-сын-ае,
за-дачка-е…

Месяц сёмы

І вось ужо
нібыта ліска я,
што з’ела
найсмачнейшы калабок.
І нельга мне
на спінцы паляжаць,
а толькі правы бок,
а толькі левы бок.
Цяпер качуся я,
а не іду
і, гледзячы
ў нябеснае паўшар’е,

KAMUNIKAT.org

нібыта поўня,
поўніцай жыву,
хоць ведаю,
што ветах мой настане,
як толькі прыйдзе час
свяціць
маладзіку…

Месяц восьмы

Аднойчы жнівеньскім ранкам
збяжыць ад мяне
цяжарнасць
і толькі лёгкасць Быцця
застанецца
для каханага, мяне
і дачушкі Альжбэты,
пакуль і да яе
не прыйдзе цяжарнасць,
каб потым лёгкасць
ізноў засталася
невыносная
без цяжарнасці
твайго працягу…

Месяц дзевяты

Адслоненыя ад усіх,
набліжаныя да працягу
ў дворыку радзільні
таньчым
павольны танец
пад цяжкі рок
маёй відавочнай
і тваёй прыхаванай
цяжарнасці…

KAMUNIKAT.org

Месяц першы

Сонца заходзіць за радзільняй.
Чырвонае
ад крыку немаўляці,
якое яшчэ не крычала,
калі сонца ўзыходзіла.

– – –
Я з крыжыкаў
раблю сняжынкі –
пераствараю смерць
у снег.
І ён халодны,
ды, памёршы ўраз,
народзіць новую вясну...

KAMUNIKAT.org

– – –
На мяжы
паміж нашымі словамі
вырастае асот,
а самота пытальнікі ставіць,
як ставяць крыжы
**?**
**? ? ?**
**?**
**?**
І адказаў няма,
і ад подыху смерці
ўзнікаюць шматкроп'і
…
… … …
…
…
Ды ад выцвілых словаў,
нібыта ад зорак памерлых,
яшчэ льецца жывое святло.

KAMUNIKAT.org

– – –
Стамілася
глядзець у вакно –
падышла да суседняга.
І за ім тое ж самае…
Стамілася
глядзець у неба –
зірнула ў калюгу.
І ёю плылі аблокі…
Стамілася
глядзець у люстэрка –
паглядзела ў вочы каханага.
Пакуль кахаю(ць) – прыгожая…
Стамілася
глядзець у сябе –
няма куды падзецца…
І зноўку гляджу
ў вакно і вакно,
у неба і ягонае адлюстраваньне,
у люстэрка і нябёсы вачэй.
Кінешся з вакна –
душа адляціць у неба,
зірнуўшы на разьвітаньне
ў калюгу з аблокамі,
люстэрка завесяць,
з нябёсаў вачэй закрапае дождж.
А вакно застанецца
шчаслівым.
Суседняе.
І за ім
тое ж самае…

– – –
Стала часта палівацць кветкі,
выглядаючы цябе праз вакно.

Кветкі захлынуліся ад майго чакання.

Цяпер баюся глядзець
праз краты з мёртвых сцяблін…

– – –
На Кальварыйскіх могілках
вясна…
Лісточкі распускаюцца
і новыя крыжы…
У незямной пакутнай цішыні
нясе стары лісток
для новага гнязда
імклівы чорны стрыж…

– – –
Сонца – бясконца,
дзень – цень,
ночы – вочы,
глеба – неба,
трывога – дарога,
людзей – надзей,
воля – доля,
чалавек – век,
краіна – сына…

У найбанальнейшых рыфмах –
глыбокі верлібр жыцця.

KAMUNIKAT.org

– – –

Апошняя кветка язміну
вось-вось у нябёсы памкнецца
пад марш пахавальны восаў…
Старая збірае тару,
нектар збірае пчала…
І хто пакладзе сабе ў рот
перадсмяротны мёд
не ведае
аніхто,
хто тару здасць ад яго…
А труцень
з лянотным ценем,
а труны
з ільном вакол цела…
І слоікі ёсць ад мёду,
і ёсць бутэлькі ад гора…

KAMUNIKAT.org

## жываЯ!

Крычу ў глыбокі калодзеж,
і вада з яго ніколі не стане мёртваю.

KAMUNIKAT.org

! ! !
Глядзіцца Прыпяць,
нібыта Нарцыс,
у вочы мае…
А калі ў люстэрка
вейкі судакранаюцца,
дна прыгажосці
кранаецца
рэч-ка-ў-сабе,
у сябе зацягвае
жанчыну-ў-сабе,
а можа, і не ў сабе…
Ды розніцы аніякай,
калі на дне…

KAMUNIKAT.org

! ! !
Мама просіць:
-- Напішы верш
пра чорнага бусла,
які прылятаў у чацвер
на Лысую Гару.
Ён чорны,
але грудка ў яго белая.
Ён прылятаў упершыню
альбо я ўпершыню
яго пабачыла...
Абураюся:
-- Не пішу на замову!
А ўначы мне сніцца,
як над Лысай Гарою
кружляе бусел,
чорны, з белаю грудкаю.
Можа, ён кружляў упершыню,
а мо я першы раз
не забылася на сон,
у якім прашу:
-- Мама, дабраславі
на верш
пра чорнага бусла.

KAMUNIKAT.org

## ЧОРНАЯ АКАРЫНА

!
Абудзіў мяне цёплымі гукамі
акарыны рудой,
што ўвабрала ў сябе
спакой, незалежны ад шчасця,
што забрала ў мяне
прадчуванне жахлівага сну.
Абудзіў… І разбіў…
І на чорнай
цяпер мне іграеш…

!
Сыграй на чорнай акарыне
мне пакаранне за каханне.
Мне прадчуванне развітання
сыграй на чорнай акарыне.
Хай не жаданне, не абранне,
хай боль нікуды не адрыне –
сыграй на чорнай акарыне
мне пакаранне за каханне.

!
Чорная акарына
ў вуснах тваіх…
А я чакаю,
каб счарніць
твае вусны
ці то чарніцамі,
ці то пацалункамі…

KAMUNIKAT.org

!
Ноч. Акарына
чорная спіць на стале,
а ты – са мною.

!
Прыцісну да вуснаў
тваю чорную акарыну,
і боль паплыве бязгучны.
І ніхто не скажа,
што не ўмею граць.

! ! !
Сціскаецца цішыня
              непаразумення
                        да крыку.
Сціскаецца вышыня
              кахання
                        да стогну.
Сціскаецца глыбіня
              любові
                        да крыку.

І зноўку
народзіцца той,
хто зразумелы не будзе...
Небу
і тым,
хто глядзіць у яго
альбо і не...

KAMUNIKAT.org

! ! !
Я сёння з Караткевічам начую…
І ноч кароткая,
і пакарання мне няма…
У кнізе,
быццам на кары бярозавай,
у чорных рысках –
глыбіня святла…

Я заўтра з Караткевічам начую.

! ! !
А Віцебск зараз
у тваіх вачах,
і ты лятаеш
у яго нябёсах.
Так проста тут
Шагала прыгадаць,
так лёгка мне
над Лунінцам лунаць,
не маляваць,
не мроіць,
не ўміраць –
гучаць,
як Прыпяць,
у палескім слове.
І гэтым словам
вымавіць цябе,
і гэтым словам
вымаліць цябе,
і гэтым словам
вымаўчаць цябе
і лёсна,
        і балесна,
                і нябёсна…

KAMUNIKAT.org

! ! !
Ты мяне ратаваў
ад шэршня,
я цябе ратавала
ад шэрасці,
ад зашэрхласці адзіноты,
я дарыла табе самоту,
даравала табе – са-мной-ты,
паэтычнаю і празаічнай,
трагедыйнаю і камічнай,
ашалелаю і вясёлай,
шашаль труны тачыў
нам новыя…
Шэдэўральна
яны рассыпаліся,
як да шчасця ў жыцці
дакраналіся…

! ! !
Я так люблю жыццё,
што паміраць не страшна.
Пакіну іншым
месца на Зямлі,
дзе ўсе аблокі
ў пошуках Радзімы,
дзе кветкі
абступаюць камяні,
дзе ў снезе
белыя сляды твае
не знікнуць,
а знікнуць
здрады чорныя сляды…

KAMUNIKAT.org

! ! !
Спарахнеў журавель
з калодзежа каля дзедавай хаты,
дзе даўно ніхто не жыве...
-- Журавелю мой!
Не набраць без цябе мне вады,
толькі крыкнуць,
як у маленстве, магу
ў глыбокі калодзеж,
можа быць, А,
можа быць, У.
І пачуць,
як адгукаецца
Вечнасць.

KAMUNIKAT.org

**жываЯ.**
Колькі самоты і суму
ў найменшым знаку
прыпынку.

KAMUNIKAT.org

. . .
-- Колькі накуеш, зязюля,
быць жывою,
столькі буду помніць
пра цябе...

Доўжыцца
шэрая адзінота...

. . .
Ніцыя лозы
і тыя прамовілі сёння:
“Ты – чужаніца...”

KAMUNIKAT.org

. . .
Вы казалі – мядовыя,
Вы казалі – чайныя,
арэхавыя і шакаладныя
вочы мае.
Вы кахалі – мядовыя,
Вы кахалі – чайныя,
арэхавыя і шакаладныя
вочы мае.
Не казалі – самотныя...
Не кахалі – самотныя...

. . .
У лабірынце празрыстага суму
блукае маё каханне
і не шукае выйсця –
так шмат у жыцці суму,
так мала празрыстасці...

KAMUNIKAT.org

. . .
Ты падаеш надзею мне,
а жабраку –
рубель апошні…
Ды не глядзіш
у нашы вочы…

. . .
З’ехаць бы
ў найдзічэйшы куток Беларусі,
дзе не ступала нага чалавека.

Але, калі такі ёсць,
няхай застанецца…

І так засмечаны свет
слядамі самоты…

KAMUNIKAT.org

**жываЯ;**
кропка з коскаю
разам,
хоць такія розныя,
як людзі,
з якімі жыву.

KAMUNIKAT.org

; ; ;
Гістарычны,
дэтэктыўны,
інтэлектуальны,
любоўны,
навукова-фантастычны,
прыгодніцкі,
сатырычны,
сацыяльна-псіхалагічны,
утапічны,
філасофскі.

І ўсё гэта
пра наш з табою
раман.

KAMUNIKAT.org

; ; ;

*В. ад А.*

Пачатак імя майго
вымавіць можна
без удзелу вуснаў*.
А твайго –
выбухны,
звонкі,
вуснава-зубны
зычны гук –
найлепш вымаўляецца
ў пацалунку.

* А – галосны сярэдняга рада ніжняга пад'ёму, які вымаўляецца без удзелу вуснаў.

; ; ;
Чакаю не цябе.
Але ты, убачыўшы,
бяжыш напрасткі, абдымаеш,
рады нечаканай сустрэчы:
-- Ты такая рамантычная,
ты не можаш не напісаць,
як я бег да цябе па сумётах.
Смяюся, што гэта будзе
хоку з глыбокімі слядамі.
Развітваемся,
разыходзімся ў розныя бакі.
Вяртаюся,
каб чакаць не цябе.
У чаканні
пералічваю твае сляды –
семнаццаць...

; ; ;
Калі ў акно глядзіць
Мядзведзіца Малая,
мы каву п'ем, нягучна размаўляем
пра слынныя санеты ад Шэкспіра,
і пераклады строф Дубоўкам, Пастарнакам.
У іх шукаем зоркі мы і знічкі,
і паміж іх знікае кавы
шчаслівы сёмы кубак.
Нарэшце я ў талерку выліваю гушчу,
па ёй пішу іголкаю яловай,
што засталася з навагодніх святаў:
-- Каханы мой,
цяпер акно завесім,
бо сёння там
цікаўная Малая...

kamunikat.org

Э-дыпціх

1
На пасцельнай бялізне
ў пастэльных танах
з японскімі іерогліфамі
ты ляжыш,
нібыта сярэдні радок
хоку,
а я,
карацейшая на два склады,
спрабую быць
ці першым,
ці апошнім,
пакуль не паглынае
сярэдзіна…

2
На бялізне
ў егіпецкім стылі
я –
твая Неферціці –
працягваю табе
мумiё,
чорнае,
нібы літары вершаў,
гаючае,
нібы сэнс,
мумі-
я,
я,
быццам мумія,
ляжу некалькі хвілінаў,
а падаецца –
тысячагоддзі…

KAMUNIKAT.org

Невыносная гульня,
хутчэй забірай мяне
з мёртвага Егіпту
ў беларускую жарсць…

; ; ;

Падаю ў бездань
і падаю ў неба…
Прымаю ў падарунак
твайго сіняга насарога
і адпускаю гуляць далей
па снах Беларусі.
А табе выпякаю тры пірагі:
з чарамі – каб жыццё віравала,
з мохам – каб не баяўся нябыту,
з чаромхаю –
каб сны былі, як дзеці, прыгожыя…
Ты пакідаеш
па кавалку ад кожнага пірага
для сіняга насарога,
і ён злізвае апошні з тваёй далоні
разам з лініяй лёсу.
І я засталася б адна
разам з чарамі, мохам, чаромхаю,
ды сіні насарог
сцінае мой сон
сваім рогатам…

## ПОКЛІЧ ЗІМЫ І МЫ

;
«Аксана!» --
клічаш мяне ў снежань.
«Асанна!» --
снежню ты спяваеш.
Сняжынка на тваім лісце
не растае,
бо і расстанне
не сніцца нам,
не саступаем
яму заснежаную сцежку…
Мы адчуваем вецер страсці
ў сняжніцы снежня,
але собіць
суцішваць вуснамі і снамі
сябе,
сабе ствараючы мяжу
перад завейнасцю кахання,
за веямі якога
сцішна,
за веямі якога
стратна…
І я хваёваю галінкай
усхваляваная пішу
не па-англійску
«I love you» –
па-беларуску
«Слава снежню!»

KAMUNIKAT.org

;
Кліча студзень туды,
дзе ты,
дзе пад снегам апошняе лісце,
дзе заечыя віражы
не разблытаць ніводнай лісіцы,
дзе ласуецца сонечны промень
снегам з лецішча
і ледзяшы,
нібы зубы Змея Гарыныча,
што ўтрымае нас на адлегласці,
ды не схопіць нашыя сны,
абароненыя Гарою,
ці аброненыя сасною,
ці слязою…
Ці па лязе…
Кліча студзень,
і сам ідзе…

;
Люты не грае на лютні…
Гукі дуды
ў ім пазначаюць прастору,
дзе створаны мы
клікаць сябе
і чакаць,
хто пакліча яшчэ…
І паралічваць
кароткія дні,
што паволі даўжэюць
і забывацца,
што снег растае
ад пякучага болю,
і адчуваць у апошніх сняжынках
вясновую прагу да волі.

**(жываЯ)**

хаваюся ў ахоўныя дужкі,
каб адразу ж з іх вырывацца.

KAMUNIKAT.org

( ) ( ) ( )

Імя* маё
ў сабе хавае,
што чужаніца я
і госця.
Я з тых часоў,
дзе ўсе жывыя.
Я ў часе тым,
дзе шмат паўмёртвых.
Мне б дзесьці стаць
зусім сваёю,
камусьці стаць
зусім не госцяй...
Ды мне не дадзена спакою,
а толькі шлях
шляхотна-крохкі
і зрэдку дзіўныя імгненні,
як падалася
не чужою...

---

* Ксенія *(грэч.)* – іншаземка, чужаніца, госця.

( ) ( ) ( )
Полымя
яшчэ больш рыжэе языкамі,
калі яго лашчыць сонца...
І агню
не заўсёды стае цяпла.

( ) ( ) ( )
Разнасцежаныя дзверы царквы,
ніхто не заходзіць...
І я праязджаю міма
і толькі шапчу:
«Божа, памілуй...»
Нібыта з малітвы, словы кіроўцы:
«Плошча Свабоды».
Дзверы адчыняюцца,
ніхто не выходзіць...

KAMUNIKAT.org

( ) ( ) ( )
З царквы выходжу
ў белую завею...
Сняжынкі, як працяг
малітвы светлай,
а людзі ў чорным,
чорным,
чорным,
чорным,
як літары, што выпалі з нябёсаў
і на зямлі не могуць затрымацца,
не могуць
у руку, што працягнула,
не грошы,
а далонь сваю пакласці.
I п*а*даюць з маёй рукі паперкі,
і нехта ловіць
іх яшчэ ў паветры...
Удзячны Богу,
вып’е ён гарэлкі,
руку працягне
з чаркай да кагосьці
і, можа, скажа тост:
«За разуменне»...

( ) ( ) ( )
На фотаздымку --
туга.

Фатограф,
пакінуты каханай,
злавіў яе ценькі ўскалых
у крыльцах матылька,
што апынуўся
ў празрыстым павуцінні.

KAMUNIKAT.org

( ) ( ) ( )
На Чорным возеры
ратуюся лілеямі.
На Белым возеры
ўглядаюся ў празрыстае дно.
Прачытала запіс:
«На беразе знойдзена вопратка
невядомага мужчыны»...
Узгадваю:
ты стаіш з белай лілеяй,
а я гляджу на яе дно:
«На белым пялёстку застаецца адзенне...»
Дадаю:
«невядомай жанчыны»,
хоць ведаю -- маё...

( ) ( ) ( )
У мяне ёсць нешта
ад пантэры і пумы.
У мяне ёсць нешта
ад ільва і львіцы.
У мяне ёсць нават
рысы ад рысі.
Ведала: табе
падабаюцца коткі,
але аказалася –
толькі свойскія...

( ) ( ) ( )
Пачала вучыцца
забываць цябе
і адразу адчула,
што я з тых вучаніц,
якія бяруць прадмет
не здольнасцямі,
а карпатлівай
цярплівасцю.

KAMUNIKAT.org

## ЗА НЕБА

*Паэма-імкненне**

пытанні без пытальнікаў і літар…
каб ты свае пытанні кінуў межамі,
вядзьмарыць, падаючы ў бездань,
а свята – з чарадою сноў і крыку
А свята – без гармоніі і смеху,
ўзнікаю я…
сёмым святам свету
І раптам
нябыту сум і гарката быцця…
Слова і гарэлка,
Сябры і горы,
зямлі і неба, веры і віны.
на свет глядзіш з глыбокага прадоння
ад мудрасці, ад пошуку яе,
**Т**ы мне вястуеш мудрасць і знямогу
***Лесвіца першая***

«АД СУТНАСЦІ»…
танцуем быцця тайніцу
Абвітыя плюшчом кахання,
Заплюшчваем вочы.
Не хапае чужой адсутнасці…
цалуемся.
Як толькі знойдзем –
Шукаем сузор'і.
Выходзім.
Не хапае зорак…
**Т**анцуем і цалуемся.
***Лесвіца другая***

---

* **Радкі кожнай лесвіцы чытаюцца знізу ўверх.**

з нашым жаданнем…
У цішыні знічка знікае
ў Птушыным Шляху.
Наш крык знікае
ў крыку нашым.
**К**рык птушкі знікае
***Лесвіца трэцяя***

цішыня ў чаканні пераменаў…
мы з табой, як нашая краіна:
скінута бясконцае адзенне,
А калі пакінуты Парыж,
чорны пан, чырвоная паненка…
**М**ы з табой у колерах Стэндаля:
***Лесвіца чацвёртая***

чаромхавыя…
і халады пасля
белыя сны
Пасля вяртання –
сумоўе цел…
не ўспамінаем
сумоўе душаў,
і забываем
І паасобку адтуль ляцім,
у неба бясхмарнае…
а мы сыходзім
ў сырую зямлю,
Сыходзяць кроплі
пасля кахання.
Водар чаромхі
пасля дажджу.
**В**одар чаромхі
***Лесвіца пятая***

пасля кахання.
Вочы такія ў цябе

і вецер без хваляў…
і доўгае куванне зязюлі,
і мёртвыя голкі і галінкі,
нябёсы і дрэвы
**У** калюгах на дарозе лясной
***Лесвіца шостая***

за неба змаглі даляцець…
каб пырскі ад болю
абрынуцца ў неба,
Нямым вадаспадам
крык параненай мовы.
шукаць і адчуць у сабе
крык і енк ненароджаных думак,
**Ш**укаць у табе
***Лесвіца сёмая***

ніколі не будзе…
што ягадаў чорных
мне даравацъ,
І папрасіла Неба
ты – невымольнае…»
«Ты – невымоўнае,
і напісала на чорнай зямлі:
зламала галінку з белымі кветкамі
у сумоўі маўчання і думак
**У** вар’яцкім квітненні чаромхі,
***Лесвіца восьмая***

пайсці ўгару…
за тры прыступкі да зямлі
затрымцець,
ў тваіх словах,
затрымацца
зачапіцца за воблака,
глядзець,
ісці,
ўніз
**П**а белай лесвіцы
***Лесвіца дзевятая***

працяг з пытанняў вечны…
І вусцішна, калі за небам
што з сабою пытанні неслі…
у тыя вочы,
што глядзелі за свет нябёсаў,
у тыя вочы,
а я хачу зірнуць у вочы,
**Т**ы хочаш зазірнуць за неба,
***Лесвіца дзесятая***

сарваўшы кветку.
крыкнуць,
і ўпершыню пад небам
і знічкай на зямлю ляцець
і вырывацца за яе,
Рваць думкі вышынёй
і за неба – піць…
**П**іць неба
***Лесвіца адзінаццатая***

за сябе.
імкненне яго
адлюструе не неба,
І Сена тады
сухімі вачыма...
І ў неба глядзець
і зарывацца ў пяшчоту духмяную.
сухую праўду
З іх буду выцягваць
калі без цябе застануся зімою.
на выпадак,
ў стагі
ад болю і асалоды
складаю стогны
заблытаная пяшчотай,
**З**аблытаная словамі праўды тваёй,
***Лесвіца дванаццатая***

KAMUNIKAT.org

**«ЖЫВАЯ»**
двукоссе,
нібыта мэвы над
морам,
якога няма.

KAMUNIKAT.org

« » « » « »

Ку-ку, ку-ку, ку-
ку, ку-ку, ку-ку, ку-ку,
ку-ку, ку-ку…

Недакувала зязюля
хоку.

« » « » « »

На валасах маіх сняжынка,
а ў Вільні дождж…
І ты блукаеш з ім самотны,
гарэлку п’еш,
чытаеш вершы вузкім вулкам
і храму з хмар,
і прад вачыма слёзы Ганны –
нібыта лёс наш…
А ў валасах маіх сняжынка
не растае,
я тут, у Мінску,
пакуль без Вільні,
і без дажджу,
і без цябе…
Ды хоць і зімна мне –
чамусьці верыцца,
што пойдзе дождж,
прыедзеш ты
і Вільня вернецца…
што з намі Бог…

« » « » « »

Малю,
малюю словамі,
ды ўсё адно
прыходзіць час
не цішыні,

KAMUNIKAT.org

а нематы…
НЯМА ЦЯБЕ –
не выма-
ВІЦЬ,
а выма-
ВЫЦЬ…
Прыходзіць час
няўмольна выцінаць
на ўскрайку ўласнага быцця
малітву…

« » « » « »
Снежная баба знікае
ад цяпла,
а я ад холаду.
Вось і скончылася
наша зіма…

« » « » « »
Мужчыны адыходзяць,
як Радзіма
ў гісторыю,
дзе Княства і Статуты.
Мужчыны адыходзяць,
а нябыту
няма для іх…
І я сябе гартую,
гартаю акравершы і санеты
і веру ў сны,
што разам мы саснілі.
Мужчыны адыходзяць,
як Радзіма,
бо ведаюць,
што рай яны
згубілі…

## ХОКУ ЦАРКОЎНАЙ ВУЛІЦЫ

*Лунінцу*

« »
Царква на шляху
ад хаты і на шляху
да хаты – царква.

« »
Усе словы ад
пылу вавілонскага
крыху шэрыя.

« »
Ем зялёпухі.
Смак маленства і міну-
лага стагоддзя.

« »
Сон вышывала
чорнымі літарамі.
Крыжыкі спалі.

« »
Пад лунінецкі-
мі зоркамі падаюць
грушы. Свецяцца...

« »
Поўныя вочы
ўспамінаў пад поўняю...
Ветах чакаю.

KAMUNIKAT.org

« »
Узіраюся
ў снег, смех, смерць, не бачу, як
старэюць птушкі.

« »
На кроп малады
дожджык крапае. Мыю
старую бульбу.

« »
У сівых вачах
памяць пра сіні лён
жывіць надзею.

« »
Валошак букет...
Пералічваць не трэба
на жыццё альбо смерць.

« »
У шыбу грукну
пустой хаты і хоць ёй
прамоўлю: «Свае!»

« »
З далоні ў далонь
перасыпаю пясок.
Цяплей і меней...

« »
Высыхае ўсё
каля хаты маленства,
але не слёзы.

KAMUNIKAT.org

« »

Пёрка ад пеўня
і слёзы на літарах
у сшытку з хоку.

« » « » « »

То клякочуць буслы,
то вароны над намі крычаць…
Мы прыходзім у свет
і сыходзім у свет…
І на тым, і на гэтым
як буслам – клекатаць нам,
і на тым, і на гэтым
нам крычаць – як варонам…
І ў зямное цішы,
і ў цішы незямное
мы сябе пракрычым,
сябе праклякочам.
Мы прыходзім у свет
і сыходзім у свет…
І на тым, і на гэтым –
не змаўкаючы
моўкнем…

« » « » « »

Скок-ну-ла жаб-ка
ў са-жал-ку ра-зам з зор-кай.
За-га-даць хо-ку

я не паспела…

KAMUNIKAT.org

## жываЯ

не стаўлю знакаў прыпынку, але
то засвеціцца кропкай у начы самотнае акно
і разам з маім створыць двукроп'е.
То ўпадзе працяжнікам спілаванае дрэва,
а не гэтак даўно яно яшчэ клічнікам сцвярджала
зямлю і нябёсы.
То полымя выгнецца пытальнікам,
а пасля, недачакаўшыся адказу,
возьме ў гарачыя дужкі ўсё, што імкнулася жыць,
але да чаго смерць імкнулася болей.
То дзіця намалюе коску і ўбачыць,
што яна замянілася ў апалоніка,
а пасля ў жабку, каралеўну,
але ж міне дзяцінства,
коскі не нагадаюць больш апалонікаў,
жабкі застануцца жабкамі,
а каралеўнаў давядзецца браць у двукоссе.
То на мапе слёзнага неба не аднойчы
высахнуць шматкроп'і,
і нібыта кропка з коскаю будуць свяціцца
зорка і маладзік,
пакуль яна не згарыць у палёце.

Гэтыя знакі прыпынку —
дзеля таго,

каб св**А**е імгненні мы не прапусцілі,
пакуль жывы**Я**.

кроплі дажджу на шкле
малююць зорнае неба

Млечны Шлях
пазначаны
рукою дзіцяці

цела маё стане
зямлёю
душа мая стане
небам
а пакуль я
лінія далягляду
колькі не набліжайся
аддаляюся
каб застацца сабою

такое
поўнае жыццё,
што вось-вось
падасца
перальецца
ў нябыт

і ніхто
не наважыцца
адпіць
з маіх вуснаў

KAMUNIKAT.org

**П**акута **П**
а

к
у
т
а
л х
ы
**П** енм алуніка**П**

дудар забірае
свет белы
ў душу
пасля бярэ
ў вусны дуду
і выпускае
ў свет белы
душу

за чорным катом
іду па галінах самотнага дуба
пакуль не пачую
што плача дуда
і зорка ляціць
а не падае
і з ёю
жанчына
што бачыць пад поўняй
свайго дудара

KAMUNIKAT.org

спатоленая
навальнічным водарам
дарам
адчуваць цябе
ў палёце свабоднае птушкі
у рэдкім матыльку
не злоўленым табою
у трапяткім і зменлівым ценю
самотнага дуба
пад якім так любяць цалавацца
закаханыя
спатоленая
навальнічным водарам
оду складаю
дару адчуваць цябе
а пад дубам
пад дубам
цалуемся
не мы
крык нямы навальніцы
валам дзевятым
я і ты
даруем адно аднаму
дарогі чужыя
ды і родныя
адно аднаму даруем

анёлкам мяне называеш
не заўважаеш
як крылы знікаюць
зорачкай      клічаш
не бачыш
як знічкай злятаю
казкай мяне вызначаеш

KAMUNIKAT.org

не адчуваеш
як чарадзейная
ў чараду пападае
да сацыяльна-бытавых

двух акцёраў тэатр
мы з табою стварылі
у п’есе сучаснай
мы выконваем ролі
сталі сцэнаю
сцены ўласнай  кватэры
і банальнае
*Быць ці не быць*
пераходзіць
у наша банальнае

тыя
каго я калісьці кахала
не застаюцца адзінокімі
ім спадарожнічаюць
мае німфы
аксаніды*
адчуваю нараджэнне
найбольш прыўкраснай

паміж поўніцай і поўнаю чаркаю
мая сляза скоціцца
а на нечым шляху
ўвесь пыл
будзе прыбіты

---

* Аксаніды – німфы акіяну (памылка друку): трэба “акіяніды”.

за бальнічным вакном
баль
ранішні
восем
танцуе восень
лісцем і галасамі
за спінаю смех
хворай жанчыны
не павярнуцца
бо цяжка паверыць
сабраць бы мех
залатога лісця
і захаваць
між старонак Бібліі
ды навошта
яму ляцець
у вакно бальнічнае
а вецер крыжуе
дзвюма галоснымі
в*о*сеньскі б*а*ль,
*а*сенні б*о*ль

не гарманічная
без імя
на глызе граніту
з Мікашэвіцкага кар'еру
яшчэ не ўзарванай
не выдранай часам
разам са мною
гранічна чужою
натоўпу і адзіноце
я гарнуся да месца
у якім нарадзілася
да Лысай Гары
у яснай прасторы якой

KAMUNIKAT.org

мой развеецца прах
да гранічнасці просты
і тады ўжо ніяк
не парушу гармоніі
хіба папрашу
пасадзіць аронію
між елак і соснаў
для пеўчых
і чорных драздоў

у адзіноце
ўзгадваю
назвы нотаў
**ДО**
**РЭ**
**МІ**
**ФА**
**СОЛЬ**
**ЛЯ**
**СІ**
**ДО**-
сыць
называць
непатрэбнае
бо не спяю паводле нотаў
ніводнага імгнення жыцця
але з душою спяю пра
**ДО**лю
і **РЭ**ха
і **МІ**лаванне
і **ФА**нтазію
і **СОЛЬ** зямлі
і **ЛЯ**сы
і **СІ**нечу
і **ДО**-
сыць

KAMUNIKAT.org